Аўтар: Кінга Красіцкая
12.11.2017 00:00

Ці стануць 1 і 2 лістапада выхаднымі ў Беларусі?

На сайце zvarot.by распачалася кампанія па зборы подпісаў за тое, каб урачыстасць Усіх Святых і Задушны дзень зрабіць непрацоўнымі днямі. Аўтары петыцыі адзначаюць, што ў пачатку 1990-х у Беларусі Задушкі былі выхадным днём, што давала грамадзянам магчымасць выканаць хрысціянскі абавязак і ўшанаваць памяць продкаў, наведваючы могілкі.

Калектыўны зварот будзе накіраваны ў Савет Міністраў і Адміністрацыю Прэзідэнта 7 снежня. Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч станоўча выказаўся адносна гэтай прапановы. †

Ватыканскія спартсмены падтрымалі місіянераў у Індыі

Сваю згоду з дзейнасцю салезіянскіх святароў, якія вядуць барацьбу са з'явай выдавання непаўналетніх дзяўчат замуж за дарослых мужчын, выказалі спартсмены з клуба "Athletica Vaticana". "Марафонцы Папы", як назвалі ватыканскіх спартсменаў, кажуць, што іх духоўным трэнерам з'яўляецца Святы Айцец Францішак.

У забегу ў падтрымку місіянераў прынялі ўдзел швейцарскія гвардзейцы, жандармы, супрацоўнікі ўстаноў Рымскай курыі, Ватыканскай пошты, аптэкі, музеяў, радыё і газеты "L'Osservatore Romano".

Папскі ўніверсітэт прадставіць кнігу пра Касцёл у СССР

Выдаўцом выступіць кс. Ян Мікрут, а аўтарам прадмовы – Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. Іерарх, чыя вучоба, а затым

пастырскае служэнне праходзілі ў Расіі і Беларусі, узгадвае канкрэтныя гісторыі з камуністычных часоў і перыяду адраджэння. “Сёння каталіцкі Касцёл у Расіі і іншых краінах, якія ўзніклі пасля распаду СССР, мае пастаянныя структуры і дынамічна развіваецца”, – напісаў арцыбіскуп Кандрусевіч. Па яго словах, нягледзячы на ўсе цяжкасці, лакальны Касцёл актыўны ў душпастырстве, а таксама ў сацыяльнай і культурнай сферах. “Калі б у часы пераследу не было герояў веры, не адбылося б настолькі хуткае адраджэнне супольнасці верных”, – выказвае меркаванне Мітрапаліт.